адмаўляць у дапамозе для дасягнення агульнай мэты – аховы здароўя і папраўкі пацыента.

Вобраз урача выражае сабой пэўныя ўяўленні пра стан урачэбнай прафесіі і медыцыны ў цэлым. На сённяшні дзень асоба ўрача знаходзіцца ў цэнтры ўсеагульнай увагі. Усё часцей гэты вобраз паўстае з экранаў тэлевізараў: рэкламныя ролікі, тэлеперадачы. Нярэдка вобраз урача ўсплывае ў інтэрнэце, у тым ліку і ў сацыяльных сетках. Не абыходзіцца без яго і ў сучаснай літаратуры (М.Герчык, Ю.Станкевіч, А.Дзялендзік і інш.).

З усяго вышэй сказанага выцякае, што сучасны ўрач не можа дазволіць сабе выказвацца некарэктна і груба як у адрас пацыентаў, так і ў адрас калег. Для пабудовы даверлівых адносін паміж пацыентам і ўрачом апошні павінен выклікаць належнае ўражанне ўжо пры першай сустрэчы, і тут немалаважную ролю адыгрывае культура маўлення. Неабходна ўмець трымацца сціпла, тактоўна, але пры гэтым не губляць сваёй годнасці. Правільнасць, паўната, зразумеласць для кожнага пацыента і прытрымліванне ўрачэбнай этыкі – вось асноўныя характарыстыкі маўлення ўрача. Ад культуры маўлення ўрача залежыць хуткасць працэсу папраўкі пацыента.


ЛІТАРАТУРА:

1. Кодекс врачебной этики: утв. Мин-вом здравоохранения Респ. Беларусь 03.02.1999.
2. Конечный, Р. Психология в медицине / Р. Конечный, М. Боухал. – Прага : Авиценум, 1983. – 405 с.
3. Национальный Интернет-портал Республики Беларусь [Электронный ресурс] / Национальный центр правовой информации Республики Беларусь. – Минск, 2005. – Рэжым доступу: http://www.pravo.by/. – Дата доступу: 21.10.2018.


## АНТРАПОНІМЫ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ПРОЗВІШЧАЎ СТУДЭНТАЎ ГРДМУ)


УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»

**Мамедава С.А., студэнтка 1 курса лячэбнага факультэта**

Кафедра рускай і беларускай моў

Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В.І.


Прозвішчы ўзніклі вельмі даўно. Адна з прычын іх узнікнення – недастатковая колькасць уласных імёнаў (традыцыйных і царкоўных), якая не магла задаволіць патрэбы грамадства, бо гэта прыводзіла да іх частага паўтарэння, стварала нязручнасці (уявіце сабе, што некалькі чалавек, якія працуюць разам, маюць адно імя).

У прозвішчах адлюстраваліся шматлікія з'явы гісторыі нашага народа, яго побыт, заняткі, звычаі. Прозвішча – гэта своеасаблівая энцыклапедыя культуры, сацыяльна-эканамічных умоў жыцця беларусаў. Нам здаецца, што кожнаму



Рэпазіторый ГрДМУ

чалавеку цікава даведацца, адкуль пайшло яго прозвішча, што яно азначае, чаму яго продкаў называлі так, а не інакш.

Апытаўшы студэнтаў ГрДМУ, мы прыйшлі да высновы, што большасць не ведаюць, адкуль паходзіць іх род, што азначае прозвішча. У сваёй працы мы пастараліся прааналізаваць каля 250 прозвішчаў студэнтаў ГрДМУ.

**Мэта работы:** прааналізаваць семантычныя і структурныя асаблівасці прозвішчаў студэнтаў ГрДМУ.

**Задачы даследавання:**

1.Выявіць семантычныя ўласцівасці прозвішчаў студэнтаў ГрДМУ.

2. Разгледзець класіфікацыю прозвішчаў студэнтаў ГрДМУ паводле структуры;

**Аб'ект даследавання –** прозвішчы студэнтаў ГрДМУ. **Прадмет даследавання** – семантыка і структура прозвішчаў студэнтаў ГрДМУ.

Прааналізаваўшы прозвішчы, можна адзначыць наступнае: па паходжанні яны вельмі разнастайныя. Тут сустракаюцца прозвішчы, утвораныя ад назваў жывёл, раслін, насякомых, і ад уласных імёнаў, і ад назвы мэблі, адзення чалавека, ад назвы з'яў прыроды, ад рыс характару чалавека, яго асаблівасцей, ад мянушак, ад назваў музычных інструментаў і іншыя.

Калі паглядзець на ўсе гэтыя прозвішчы, то можна ўбачыць, што чалавек браў сабе прозвішчы з навакольнага свету, так як яны ўзніклі ад назваў тых прадметаў, што былі побач з ім. У нашым універсітэце сустракаюцца вельмі разнастайныя прозьвішчы. У сваёй рабоце мы пастаралася прааналізаваць дзвесце пяцьдзясят прозвішчаў.

П.Сцяцко гаварыў, што шмат сучасных беларускіх прозвішчаў утварылася семантычным спосабам – шляхам пераасэнсавання былых назваў-характарыстык асоб па тых ці іншы адзнаках ці ад гутарковых формаў імя. Пазней іх унутраная форма, матывіроўка сцерлася, згубілася і найменне стала выконваць часта назыўную функцыю – функцыю вывучэння сярод насельнікаў з тыпамі самым афіцыйным імем.

Вывучэнне прозвішчаў, іх паходжання, структуры – важная крыніца для дэмаграфічных даследаванняў. Прозвішчы дапамагаюць даведацца аб гісторыі народа, яго культуры, звычаях, асаблівасцях людзей.

## ШТО НАМ ПАКІНУЛІ ПРОДКІ?

УА «Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
**Мікаілава Г.Н., студэнтка 1 курса лячэбнага факультэта**
Кафедра беларускай і рускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Ратынская Н.В.

Любыя традыцыі сваімі каранямі сыходзяць у глыб стагоддзяў. У культуры кожнага народа існуюць традыцыі і звычаі, прысвечаныя розным святам, дзе праводзяць розныя рытуалы і звычаі, апранаюць маляўнічыя народныя касцюмы, спяваюць народныя песні, размаўляюць на роднай мове,



Репозиторий ГрГМУ